# БЕЛАРУСКІЯ НАЗВЫ ЛЕКАВЫХ РАСЛІН

**Дзежыц Арцём Юр'евіч, Беларусь**
*Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт,*
*Беларусь, Гродна*
*Навуковы кіраўнік – ст. выкладчык Варанец В.І.*

Цікавасць да дадзенай праблемы абумоўлена адсутнасцю ў беларускай лексікаграфіі слоўнікаў лекавых раслін. Мэта даследавання – знайсці гістарычныя назвы лекавых раслін на беларускай мове. Створаны кароткі руска-беларускі слоўнік лекавых раслін.

*Ключавыя словы: фітатэрапія, лекавыя расліны, лексікаграфія, здароўе.*

# BELARUSIANNAMESOFMEDICALPLANTS

**DzezhicA.Yu., Belarus**
*Grodno State Medical University,*
*Belarus, Grodno*
*Scientific supervisor– senior lecturerVoronets V. I.*

The significance of this problem is caused by the absence of medical plants (herbs) dictionaries in the Belarusian lexicography. The objective of the study is to find historical names of medical herbs in the Belarusian Language. The short Russian-Belarusian dictionary of medical plants has been created.

*Keywords: herbal medicine (therapy), medical plants, lexicography, health.*

Значэнне лекавых раслін для здароўя сучаснага чалавека цяжка перааცаніць: мінімум пабочных дзеянняў, максімум карысных уласцівасцяў, шматлікія ахоўныя механізмы, магчымасць аздараўляць і дзяцей, і дарослых.

Яшчэ здаўна вырошчваннем і ўжываннем лекавых раслін цікавіліся нават цары і князі. Многае змянілася з тых часоў, але цікавасць да гаючых траў не згасла – наадварот, цяпер яна асабліва вялікая.

У наш час людзі ўсё часцей звяртаюцца па дапамогу фітатэрапіі. Сокі, адвары, настоі, розныя прымочкі і апаласкванні дапамагаюць хвораму арганізму справіцца са шматлікімі хваробамі, пазбавіцца ад пакут. Неабходна толькі добра ведаць гэтыя расліны, памятаць пра іх гаючыя уласцівасці.

На жаль, сёння ў беларускай лексікаграфіі няма поўнага слоўніка лекавых раслін і іх уласцівасцяў. З вядомых можна назваць хіба траўнік Цёткі. Мы распачалі працу над такім слоўнікам і зараз пазнаёмім з некаторымі вынікамі.

*Валериана лекарственная* – аўрыян.Шматгадовая травяністая расліна з умераным седатыўным і спазмалітычным дзеяннямі. Расліна валодае жаўцягоннай уласцівасцю і актывізуе сакрэцыю ЖКТ. Прэпараты на аснове валяр'яны эфектыўна расшыраюць каранарныя сасуды.



Репозиторий БГМУ

*Арника горная* – арніка горная. Настой расліны валодае кроваспыняльным, абязбольваючым, супрацьзапаленчым і ранагаючым эфектамі. Адвар, прыгатаваны з кветак купальніку, лічыцца добрым сродкам супраць глістоў і з поспехам прымяняецца для лячэння энтэрабіёзу.

*Барбарис обычный* – барбарыс звычайны. Настойка з лісця барбарысу валодае кроваспыняльным і жаўцягоннымдзеяннямі. Прэпараты барбарысу стымулююць скарачэнне мускулатуры, звужваюць сасуды асобных органаў, выклікаюць паніжэнне тонусу жоўцевага пузыра, валодаюць болесуцішальным і супрацьзапаленчым дзеяннямі.

*Белена черная* – блёкат чорны. Прэпараты блёкату чорнага аказваюць перыферычнае м-халіналітычнае дзеянне, звязанае з наяўнасцю ў расліне трапанавых алкалоідаў. Прэпараты памяншаюць або купіруюць спазмы гладкай мускулатуры кішэчніка, жоўцевыводзячых і мочавыводзячых шляхоў, у меншай ступені дзейнічаюць на гладкія цяглiцы бронхаў, тармозяць аддзяленне слёзнай вадкасці, сліны, слізі страўнікавага соку.

*Бузина красная* – бузіна чырвоная. Расліна валодае слабіцельным, гарачкапаніжальным, супрацьзапаленчым, антыбактэрыяльным, абязбольваючым дзеяннямі.

*Череда* – ваўчкі трохпадзельныя.Трава ваўчкоў валодае патагонным, жаўцягонным і мачагонным дзеяннямі, паляпшае страваванне, станоўча ўплывае на абмен рэчываў.

*Горечавка жёлтая* – гарычка жоўтая. У медыцыне расліна рэкамендуецца ў якасці гарачкапаніжальнага, кроваспыняльнага, супрацьзапаленчага сродку. Гарычка спрыяе нармалізацыі абменных працэсаў і павышэнню апетыту, значна паляпшае працу стрававальнай сістэмы, выкарыстоўваецца ў якасці мачагоннага, болесуцішальнага, жаўцягоннага, проціпухліннага сродку.

*Боярышник кроваво-красный* – глог крывава-чырвоны. Расліна глогу валодае гіпатэнзіўнымі, седатыўнаймі, спазмалітычнымі, супрацьзапаленчымі, слабымі жаўцягоннымі, мачагоннымі ўласцівасцямі.

*Навозник серый* – гнаявік шэры. Грыб валодае супрацьракавай, антыаксідантнай, антыбактэрыяльнай, супрацьгрыбковай і супрацьдыябетычнай актыўнасцю.

*Лапчатка белая* – дуброўка белая. Прэпараты дуброўкі белай выкарыстоўваюць для паніжэння ціску. Таксама валодаюць антысептычнымі, ранагаючымі і проціпухліннымі ўласцівасцямі. Вядома таксама, што дуброўка белая выяўляе антыбактэрыяльную актыўнасць, спрыяе рассмоктванню мяккіх пухлін, вузельчыкавых утварэнняў, паляпшае структуру валасоў і пазногцяў.

У актыўным выкарыстанні сёння на Беларусі налічваецца каля пяцісот розных лекавых раслін. Значная большасць з іх была вядома беларусам яшчэ з даўнейшых часоў. І кожная з гэтых траў мела сваю адметную беларускамоўную назву. Наша задача – даць другое жыццё гэтым назвам, папулярызаваць праз слоўнік станоўчыя якасці лекавых раслі, дапамагчы лепш арыентавацца ў іх беларускамоўным грамадзянам нашай краіны.

Рэпазіторый БГМУ